18 лютага ў **Свіслацкую раённую бібліятэку** былі запрошаны вучні 11 класа СШ №2 імя М.П.Масонава на **моўны турнір "Якія знаёмыя назвы і словы, якая цудоўная родная мова!”**, прысвечаны ***Міжнароднаму дню роднай мовы***.



Бібліятэкары ў вобразе беларусачак з прывітаннямі на сакавітай роднай мове сустракалі старшакласнікаў. Ва ўступным слове яны расказалі аб заснаванні Міжнароднага дня роднай мовы і менавіта чаму ён адзначаецца 21 лютага, прадэкламавалі вершы вядомых паэтаў, якія раскрываюць шматграннасць беларускай мовы.

Рабятам была прапанавана гульня, у ходзе якой яны змаглі ўзбагаціць свае веды пра мову, прадэманстраваць, што ім ужо вядома. Спаборнічалі дзве каманды, за кожнае правільна выкананае заданне каманда атрымоўвала кветку васілёк –сімвал Беларусі.



Каб сабраць вялікі букет для нашай мовы ў дзень яе свята, рабяты пачалі турнір з размінкі “Веру не веру”, потым спаборнічалі ў конкурсах “Перакладчыкі”, “Знаўцы”, “Складзі фразеалагізмы”, “Расшыфруй прыказку”, “Конкурс паэтаў” і інш.



Вельмі напружаным і цікавым атрымаўся конкурс капітанаў “Эрудыты-мовазнаўцы”, у якім спаборнічалі найлепшыя знаўцы роднай мовы. Вельмі спадабаліся ўдзельнікам “Загадкі з вясёлай хаткі”, з якімі яны паспяхова справіліся.



Старшакласнікі склалі цудоўны букет з васількоў для нашай мілагучнай роднай мовы. Спадзяёмся, што рабяты даведаліся шмат цікавага і новага на нашай сустрэчы, разам з тым і праверылі свае веды. А шчырыя, сардэчныя і цёплыя словы беларускай мовы будуць заўжды гучаць з іх вуснаў і ўпрыгожваць іх жыццё. Напрыканцы сустрэчы ўсе прысутныя выказалі сваю павагу да роднага слова, разам зачыталі радкі В.Шведа “10 запаведзяў”, склалі эмблему нашай сустрэчы “Я люблю родную мову!”.

